Каждая из методик стимуляции речевого развития детей с ЗРР носит системный характер и включает развитие двигательной, познавательной, эмоциональной и коммуникативной сфер ребенка. Они направлены на развитие основных механизмов речевой деятельности: формирование мотивационно-побудительного компонента для стимулирования инициативы к взаимодействию и становление сенсомоторных навыков (слуховых, артикуляционных и моторных) для осуществления речевого акта.

Важно подчеркнуть отсутствие универсальной стратегии и методики по стимуляции развития речи у детей с речевым дизонтогенезом. Это связано с тем, что каждый ребенок обладает уникальным профилем развития и требует индивидуального подхода, учитывающего конкретные механизмы возникновения дефицита в развитии речевой системы, возрастные особенности и мотивационные ресурсы. Эффективность воздействия зависит от компетентности специалиста, его гибкости в комбинировании коррекционно-развивающих методов и степени включенности семейного окружения.

**Заключение**. Представленные стратегии являются не инструментом коррекции дефицита, а помогают в содействии естественным механизмам речевого онтогенеза. Для ребенка с ЗРР в контексте освоения сложных для него навыков речевой и коммуникативной направленности важно закреплять и актуализировать их в безопасных и доверительных отношениях с родителями. Именно родитель может организовать рутинные бытовые ситуации для речевой практики. В свою очередь логопед консультирует членов семьи по вопросам организации домашней коррекционно-развивающей среды, обучает их новым паттернам взаимодействия.

1. Жулина, Е.В. Вариативные стратегии логопедического сопровождения детей раннего возраста с задержкой речевого развития и их семей / Е.В. Жулина, И.В. Лебедева, Д.С. Брюзгина // Проблемы современного педагогического образования. – 2023. – №78-1. – С. 136-138.

2. Шашкина, Г.Р. Логопедические технологии диагностики речевых нарушений у дошкольников / Г. Р. Шашкина, В. Е. Агаева, Е. В. Красноперова [и др.]. – Москва : ООО "Научно-издательский центр Инфра-М». – 2022. – 238 с.

3. Приходько, О.Г. Современные подходы к психолого-педагогической помощи семье ребенка с отклонениями в развитии / О.Г. Приходько, О.В. Югова // Вестник МГПУ, серия «Педагогика и психология». – 2013. – № 3 (25). – С. 107-119.

4. Чеканова, М.В. Психолого-педагогическая характеристика детей с задержкой речевого развития / М. В. Чеканова. – Профессиональное образование в России и за рубежом. – 2016. – № 4 (24). – С. 151-154.

## ФУНКЦЫІ КАШТОЎНАСНЫХ АРЫЕНТАЦЫЙ У КАНТЭКСЦЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

***Андрэйчык В.І.,***

*аспірант Акадэміі адукацыі, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік – Васюковіч Л.С., доктар пед. навук, прафесар*

Ключавыя словы. Каштоўнасныя арыентацыі, функцыі каштоўнасных арыентацый, фарміраванне асобы, сацыялізацыя, матывацыя, этнакультура.

Keywords. Value orientations, functions of value orientations, personality formation, socialization, motivation, ethnoculture.

Сучасны свет характарызуецца дынамічнымі сацыяльнымі, культурнымі і тэхналагічнымі зменамі, якія прад'яўляюць новыя патрабаванні да сістэмы адукацыі. Беларуская мова як носьбіт нацыянальнай культуры і гістарычнай памяці адлюстроўвае грамадскія запыты на выхаванне асобы з выразнай духоўна-маральнай пазіцыяй. Мова становіцца рэсурсам для сацыялізацыі, што абумоўлівае неабходнасць інтэграцыі каштоўнаснага кампанента ў працэс яе выкладання. Як падкрэсліваюць Г.І. Нікалаенка і І.У. Таяноўская, "павінна быць узаемнае змяшчэнне і ўзаемадзеянне асобасных сэнсаў, каштоўнасных перакананняў, норм разважанняў і паводзін" [1, с. 58]. Гэтыя арыенціры патрабуюць сістэмнага злучэння асобаснага і сацыяльнага. Варта адзначыць, што беларуская мова ў адукацыйнай прасторы функцыянуе не толькі як сродак камунікацыі, але і як інструмент фарміравання каштоўнаснай свядомасці навучэнцаў.

Нягледзячы на значную ўвагу навукоўцаў да гэтай праблемы, пытанні тэарэтычнага асэнсавання функцый каштоўнасных арыентацый патрабуюць дэталёвага вывучэння. Вучоныя (Н.М. Антановіч, Г.І. Нікалаенка, І.У. Таяноўская, В.А. Сласцёнін, М.Г. Яленскі і іншыя) разглядаюць гэтую праблему з розных пазіцый, вылучаючы пэўныя функцыі, якія адлюстроўваюць шматгранны ўплыў каштоўнасных арыентацый на асобу.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца тэарэтычны аналіз асноўных функцый каштоўнасных арыентацый вучняў у кантэксце навучання беларускай мове, а таксама вызначэнне іх сістэмаўтваральнай ролі ў фарміраванні цэласнай асобы.

**Матэрыял і метады**. Аналіз і сінтэз – для вывучэння і абагульнення тэарэтычных крыніц; класіфікацыя – для сістэматызацыі і вылучэння асноўных функцый каштоўнасных арыентацый.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Даследчыкі прапануюць розныя погляды да вызначэння функцый каштоўнасных арыентацый, якія ўзаемазвязаны паміж сабой. Канцэпцыя В.А. Сласцёніна, заснаваная на сістэмным падыходзе, служыць метадалагічным арыенцірам для разумення структуры і функцыянавання каштоўнасцей. Даследчык падзяляе іх на пяць узаемазвязаных функцыянальных груп: каштоўнасці-мэты, каштоўнасці-сродкі, каштоўнасці-адносіны, каштоўнасці-якасці і каштоўнасці-веды [2, с. 116]. Мы разглядаем гэтую мадэль як падставу для выхавання вучня, які фарміруе ўласныя каштоўнасці праз педагагічнае ўзаемадзеянне. Калі праецыраваць дадзены погляд на навучанне беларускай мове, каштоўнасці, звязаныя з мовай, культурай і духоўнасцю, павінны разглядацца не ізалявана, а ў інтэграцыі. Толькі ў такім выпадку магчыма свядомае фарміраванне каштоўнасных арыентацый вучняў.

У кантэксце вывучэння маральных каштоўнасцей А.А. Грымаць разглядае іх як шматфункцыянальную структуру, якая забяспечвае ўнутраную цэласнасць асобы. Навуковец вылучае ўзаемадзеянне арыентацыйнай, ацэначнай, матывацыйнай, прагнастычнай, накіроўваючай і рэгуляцыйнай функцый каштоўнасных арыентацый, якія становяцца інтэграваным механізмам, што забяспечвае адпаведнасць паводзін асобы яе ўнутраным прынцыпам. Яны спалучаюць аналітычны, матывацыйны і практычны ўзроўні, дазваляючы фарміраваць стратэгію дзейнасці і хутка рэагаваць на змены, захоўваючы пры гэтым цэласнасць асобы [3, с. 116].

С.М. Галенка адзначае, што маральныя арыентацыі забяспечваюць самарэгуляцыю і матывацыю паводзін, а таксама ўсвядомленую дзейнасць у духоўна-маральнай прасторы. Гэтыя палажэнні падкрэсліваюць, што ў навучанні беларускай мове асаблівую ролю адыгрывае эмацыянальна-маральны досвед. Яго інтэграцыя ў маўленчую дзейнасць не толькі развівае камунікатыўную кампетэнцыю, але і служыць магутным фактарам маральнага і культурнага выхавання [4, с. 4].

У гэтым кантэксце Н.М. Антановіч і М.Г. Яленскі падкрэсліваюць, што сучасны педагог павінен накіроўваць навучэнцаў на "этнакультурнае асэнсаванне беларускай мовы" [5, с. 43]. Так, эмацыянальна-ацэначная культура настаўніка спрыяе паспяховаму засваенню мовы і фарміраванню станоўчага стаўлення да яе як да кампанента нацыянальнай ідэнтычнасці. Такім чынам, беларуская мова выконвае функцыю сацыяльнага і культурнага медыятара, што асабліва важна для развіцця эмацыянальна-матывацыйнага кампанента каштоўнасных арыентацый.

У сувязі з гэтым, Я.У. Піскун акцэнтуе ўвагу на неабходнасці разгляду этнакультуры не як дадатковага складніка, а як асноватворнай каштоўнаснай прасторы [6, с. 19]. Паводле яе меркавання, этнакультурны кампанент з'яўляецца ядром фарміравання маральнай і грамадзянскай пазіцыі. Навучанне мове, арыентаванае на культурна насычаныя тэксты, уключае вучняў у працэс асэнсавання нацыянальных каштоўнасцей, што адпавядае эмацыянальна-каштоўнаснаму кампаненту сістэмы каштоўнасных арыентацый, дзе праз станоўчы эмацыянальны водгук і адчуванне прыналежнасці да нацыі адбываецца прыняцце каштоўнасных ідэалаў.

У выніку праведзенага аналіза навуковых крыніц назіраецца адсутнасць адзінай сістэматызацыі ў разуменні функцыянальнай ролі каштоўнасных арыентацый у кантэксце навучання беларускай мове. Аднак можна адзначыць, што функцыянальная роля каштоўнасных арыентацый заключаецца ў фарміраванні матывацыйнай сферы

асобы, што ў сваю чаргу ўплывае на будучыя ўчынкі чалавека. Каштоўнасныя арыентацыі выступаюць як унутраныя фактары, якія спрыяюць фарміраванню каштоўнаснай карціны свету навучэнца.

На падставе аналізу навуковай літаратуры вылучаны шэраг асноўных функцый каштоўнасных арыентацый, якія раскрываюць іх сістэмаўтваральную ролю ў каштоўнасным станаўленні асобы: *арыентацыйна-каштоўнасная функцыя* ўзбагачае навучэнца аксіялагічнай інфармацыяй, фарміруе сістэму прыярытэтаў, светапогляд і жыццёвыя арыенціры. Яна ўключае арыентацыйны і ацэначны кампаненты, забяспечвае здольнасць крытычна выбудоўваць уласную каштоўнасную сістэму, ацэньваць з’явы і паводзіны з пазіцыі маральных норм; *матывацыйна-сэнсавая функцыя* надае каштоўнасным арыентацыям дынамічны характар, актывізуе дзейнасць навучэнца і вызначае яе сэнсавую накіраванасць. Каштоўнасныя арыентацыі ўспрымаюцца як унутраныя матывы, што спрыяюць самавызначэнню і самарэалізацыі; *сацыяльна-інтэграцыйная функцыя* забяспечвае далучэнне асобы да сістэмы норм і каштоўнасцей грамадства, фарміруе пачуццё нацыянальнай ідэнтычнасці і адказнасці, дапамагае стаць паўнавартасным членам грамадскай супольнасці; *культурна-светапоглядная функцыя* вязана з засваеннем і перадачай моўна-культурнай спадчыны, “культурнага кода” праз мову, традыцыі і сімвалы. Каштоўнасці ў гэтым аспекце выступаюць асновай фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці і адначасова адкрытасці да прыняцця іншых культур.

**Заключэнне.** На падставе аналізу навуковай літаратуры выяўлена, што каштоўнасныя арыентацыі выконваюць шматаспектныя, узаемазвязаныя функцыі, якія забяспечваюць іх сістэмаўтваральную ролю ў станаўленні асобы. У кантэксце навучання беларускай мове рэалізацыя гэтых функцый спрыяе не толькі засваенню моўных ведаў, але і выхаванню нацыянальнай самасвядомасці, грамадзянска-патрыятычных пачуццяў і павагі да сваёй культурнай спадчыны.


1. Навукова-метадычныя аспекты працэсу семантызацыі духоўна-маральных паняццяў і катэгорый: З вопыту рэалізацыі інавацыйнага праекта / Г. Нікалаенка, І. Таяноўская, М. Варакса, Т. Пашковіч // Роднае слова. – 2024. – № 3. – С. 58–63.
2. Чижакова, Г.И. Педагогическая аксиология: Монография / Г.И. Чижакова, В.А. Сластенин. – Красноярск. : СибГТУ, 2008. – 294 с.
3. Грымаць, А.А. Фарміраванне маральных ідэалаў школьнікаў : Манаграфія / А.А. Грымаць. – Мн. : Геомант, 2000. – 448 с.
4. Галенко, С.Н. Подготовка студентов педвузов к формированию нравственных ценностных ориентаций младших школьников : автореф. дис. … канд. пед. наук 13.00.01 / Галенко Светлана Николаевна ; Мн. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького – Минск, 1993. – 20 с.
5. Беларуская мова: культура, этыка, духоўнасць у люстэрку маўлення / Н. М. Антановіч, М. Г. Яленскі // Народная асвета. – 2013. – № 5. – С. 41–44.
6. Піскун, Я. У. Фарміраванне этнакультурнай кампетэнцыі ў малодшых школьнікаў сродкамі вуснай народнай творчасці : дыс. … канд. пед. навук 13.00.01 / Піскун Яўгенія Уладзіміраўна ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Нац. ін-т адукацыі – Мінск, 1999. – 134 л.


## СРАВНИТЕЛЬНЫЙ АНАЛИЗ ЭКЗАМЕНАЦИОННОЙ ТРЕВОЖНОСТИ У ШКОЛЬНИКОВ АГРОГОРОДКА И ГОРОДА В ПЕРИОД РЕПЕТИЦИОННОГО ТЕСТИРОВАНИЯ


***Барковец Е.О.,***
*студентка 3 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*
*Научный руководитель – Каратерзи В.А., магистр психол. наук*



Ключевые слова. Тревожность, экзаменационная тревожность, школьники, напряжение, репетиционное тестирование, условия проживания.

Keywords. Anxiety, exam anxiety, schoolchildren, tension, rehearsal testing, living conditions.


Экзаменационная тревожность является распространенным явлением среди школьников, негативно влияющим на их успеваемость и психологическое благополучие. Потому изучение экзаменационной тревожности у школьников является актуальной темой и проблемой современного общества. Репетиционное тестирование играет значительную роль в подготовке к государственным экзаменам, оказывая сильное психологическое давление на учащихся. Анализ экзаменационной тревожности в контексте репетиционного тестирования